# Такая **шматаблічная**

**У 2001 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны Дзень бібліятэк Беларусі. Ягоная задача — павысіць імідж гэтых установ культуры, суаднесці іх з новымі рэаліямі інфармацыйнай эпохі.**

Напярэдадні свята выкладчыкам і студэнтам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў была прадстаўлена першая ў нашай краіне серыя навукова-практычных дапаможнікаў "Прафесіяналам бібліятэчнай справы".

Сёлетнія Дні бібліятэкі ва універсітэце пачаліся з прэзентацыі праекта "Геаграфія традыцыйнага абрадавага фальклору беларусаў у кантэксце сусветнай культурнай спадчыны". Праграму прадоўжыў вернісаж мастака, кніжнага графіка, лаўрэата нацыянальнай прэміі "Мастацтва кнігі-2007" Паўла Татарнікава. Выстаўка адбылася ў галерэі "Універсітэт культуры".

Для студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў універсітэта і калег ладзілася лекцыя-прэзентацыя "Скандынавія бібліятэчная", падрыхтаваная паводле вынікаў прафесійнага візіту беларускіх бібліятэкараў у бібліятэкі Швецыі, Нарвегіі і Даніі.

Праграма святочных мерапрыемстваў, якая называлася "Такая шматаблічная і розная бібліятэка...", уключала ў сябе семінары для выкладчыкаў, супрацоўнікаў кафедр усіх факультэтаў пад агульнай назвай "Электронныя рэсурсы: алгарытмы пошуку". Прайшлі яны 10 верасня. На наступны дзень студэнты і выкладчыкі універсітэта сустрэліся з супрацоўнікамі газеты "Культура".

Сумеснымі намаганнямі нашых бібліятэкараў, студэнтаў ФІДК і спецыялістаў універсітэцкага аддзела тэхнічных сродкаў навучання быў створаны відэфільм "Віртуальная экскурсія па бібліятэцы", які цягам усяго святочнага дня — 15 верасня — дэманстраваўся на галоўным экране ва універсітэцкім холе. Завяршылася свята семінарам "Электронныя замежныя рэсурсы для адукацыі і навукі: паслугі, прадукты, магчымасці".

**Ірына СТРАЛКОВА,**
**намеснік дырэктара**
**бібліятэкі БДУКіМ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ